Цыкунова Таццяна,
ДУА «Гімназія № 4 г. Віцебска імя М.І. Дзенісенкі»,
8 «В» клас

Адзінства… Калі мне прапанавалі растлумачыць гэтае паняцце, я чамусьці задумалася пра аднакаранёвае слова адзін. І адразу ўспомніліся ўсім вядомыя прыказкі: «Адзін у полі не воін», «Адзін дуб у полі – то не лес», «Аднапчала мёду не наносіць», «Адна галавешка не гарыць, а толькі тлее». Сапраўды, што можа зрабіць чалавек адзін?

Пачынаючы з самага маленства, чалавек жыве ў сямейным адзінстве, калі падрастае, узнікае сяброўскае адзінства, школьнае адзінства, студэнцкае адзінства, працоўнае адзінства, адзінства па інтарэсах і прыярытэтах, і так можна пералічваць бясконца. На шляху ўсяго жыцця чалавека суправаджае адзінства з прыродай, культурай, традыцыямі, каштоўнасцямі таго ці іншага народа.

Мы – беларусы. Наша адзінства пачынаецца з беларускай мовы, якая прайшла складаны шлях развіцця і станаўлення: ад дзяржаўнай мовы Вялікага Княства Літоўскага да забароны ў Рэчы Паспалітай, Расійскай Імперыі. Але, нягледзячы на ўсе складанасці, беларуская мова дайшла да нашых дзён, жыве і развіваецца ў сучасным свеце. Яна яднае людзей у адну нацыю, народ са сваёй багатай культурай і традыцыямі. І гэта моўнае адзінства!

Штогод у Беларусі святкуюцца народныя святы: Каляды, Купалле, Дажынкі і шматлікія іншыя. З’яўляюцца новыя традыцыі: «Александрыя збірае сяброў», «Славянскі базар», «Viva Braslav». Людзі збіраюцца разам і святкуюць за адным сталом, на адным полі, на адной пляцоўцы. Гэта традыцыйнае адзінства!

Але не толькі ў весялосці і святах праяўляецца наша адзінства. У гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь першая з усяго Савецкага Саюза прыняла ўдар нацысцкай Германіі. Усе беларусы, ад дзяцей і падлеткаў да старых людзей, як адзін, сталі на абарону нашай краіны. Дзякуючы адзінству, мы перамаглі ў гэтай вайне. І гэта гістарычнае адзінства!

Я жыву ў сучаснай Беларусі і ганаруся, што маю дачыненне да такой каштоўнасці, як адзінства беларускага народа. Упэўнена, каб наша дзяржава ў будучыні была яшчэ лепшай, прыгажэйшай, трэба берагчы сваю Радзіму, яе культуру, традыцыі, мову, шанаваць і памятаць гісторыю, а таксама перадаваць наступным пакаленням любоў і павагу, давер і ветлівасць, адкрытасць і сумленнасць, разуменне і падтрымку адзін аднаго.

Адзінства – гэта паняцце пра чалавечнасць, жаданне быць разам, дапамагаць адно аднаму, бо так важна ў сучасным свеце жыць у згодзе,разумець адно аднаго, даражыць АДЗІНСТВАМ!